WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

12 ЖНІЎНЯ 2011 г.
ПЯТНІЦА
№ 152
(27016)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Надвор'е

НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ ПРЫПЯЧЭ ДА +32

Сёння ўдзень надвор'е ў Беларусі будзе фарміравацца пад уплывам франтальнага раздзелу, што рухаецца да нас з боку Заходняй Еўропы, паведаміла рэдакцыі начальнік аддзела метэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.

Таму ўдзень у паўночна-заходнім рэгіёне будуць кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень 18—24, на поўдні краіны да 26 цяпла. У сталіцы 21—23, часам кароткачасовы дождж.

Ужо ў суботу з боку паўднёвага захаду Еўропы да нас пачне зацягвацца даволі цёплае паветра. Уначы будзе 9—16, мінімальная тэмпература ўдзень 21—28 градусаў. Аднак актыўны атмасферны фронт прынясе месцамі невялікія навальнічныя дажджы. У нядзелю атмасферны ціск крыху паменшыцца, але пацяплее. Месцамі зноў кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы будзе 11—17, удзень — 22—29, на паўднёвым усходзе каля 30 градусаў.

А вось у першай палове наступнага тыдня чакаецца чарговая хваля моцнай спякоты. Уначы будзе сапраўды цёпла — 13—19, максімальная тэмпература ўдзень — 24—29, месцамі прыпячэ да 30—32 градусаў. У панядзелак, аўторак і сераду месцамі кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Сіноптыкі падлічылі, што ў гэтыя тры дні сярэдняя тэмпература паветра будзе прыкладна на 3—5 градусаў вышэй за кліматычную норму.

Спецыялісты амаль упэўнены, што ў гэтыя дні ў Беларусі будзе назіравацца апошняя хваля такой моцнай спякоты. І сапраўды, ужо ў другой палове наступнага тыдня, паводле папярэдніх прагнозаў, у нашай краіне стане значна свяжэй. Крыху пахаладае, але лета яшчэ працягваецца...

Сяргей КУРКАЧ.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРЫБЫЎ З РАБОЧЫМ ВІЗІТАМ У КАЗАХСТАН

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў з рабочым візітам у Казахстан, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

На працягу бліжэйшых некалькіх дзён адбудуцца нефармальныя сустрэчы і нефармальны саміт кіраўнікоў дзяржаў — членаў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Плануецца, што ў ходзе перагавораў будуць абмеркаваны актуальныя пытанні міжнароднага парадку дня, а таксама сітуацыя на прасторы АДКБ.

БОЛЬШ УВАГІ «САЛОДКАЙ» ГАЛІНЕ

Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч запатрабаваў ад прадпрыемстваў кандытарскай галіны павялічыць экспарт прадукцыі. Такую задачу ён паставіў учора ў час наведвання СААТ «Камунарка», перадае карэспандэнт БЕЛТА.

На думку кіраўніка ўрада, кандытарская галіна Беларусі крыху адстае ў інавацыйным развіцці. «Размова ідзе не аб тым, каб даць вал кандытарскіх вырабаў, гэта павінна быць сучасная высакаякасная прадукцыя, — адзначыў прэм'ер-міністр. — Так мы будзем ставіць задачу, каб палепшыць якасныя паказчыкі па нашым кандытарскім рынку».

Арганізацыі кандытарскай прамысловасці павінны будуць значна павялічыць аб'ёмы вытворчасці прадукцыі. «Аб'ёмаў надзвычай недастаткова, кожны трэці кілаграм у нас — імпарт», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. Імпарт павінен прысутнічаць, але вельмі важна, каб ён не перавышаў экспарт беларускай прадукцыі ў іншыя краіны. «А атрымліваецца, што імпартуем 60 тыс. тон кандытарскіх вырабаў, а на экспарт пастаўляем 30-35 тыс. тон, такім чынам фарміруецца адмоўнае сальда, — канстатаваў прэм'ер-міністр. — Калі нават у гэтай галіне ёсць адмоўнае сальда, то як мы можам стабілізаваць абменны курс нацыянальнай валюты?»

Прадстаўнікам айчыннай кандытарскай прамысловасці трэба будзе таксама ўдасканаліць сістэму збыту кандытарскіх вырабаў. «Мы яшчэ ідзём традыцыйным шляхам — ёсць магазін, прадукцыя ляжыць на паліцах, ідзі выбірай, — дадаў Міхаіл Мясніковіч. — Трэба ісці да пакупніка, трэба прапаноўваць сваю прадукцыю і праз гандлёвыя сеткі, і праз грамадскае харчаванне». На думку прэм'ер-міністра, кандытарскія фабрыкі павінны мець больш фірменных магазінаў і кафэ з шырокім асартыментам, здольным прыцягнуць пакупніка. У сувязі з гэтым кіраўнік урада даручыў у бліжэйшы час адкрыць у Мінску 100 такіх аб'ектаў. «Павінна быць больш кафэ, спецыяльных магазінаў, дзе можна купіць прысмакі, у тым ліку для дзяцей, пры гэтым асартымент павінен быць на належным узроўні», — падкрэсліў ён.

Аналізуючы структуру і дынаміку развіцця кандытарскага рынку Беларусі, прэм'ер-міністр у якасці станоўчага моманту адзначыў прысутнасць на ім не толькі вядомых буйных фабрык, але і прыватнага бізнэсу. «Калі з'яўляецца шмат прыватных фабрык, якія займаюцца гэтай справай, рынак развіваецца, а канкурэнцыя падштурхоўвае буйныя кандытарскія фабрыкі да таго, каб больш актыўна працаваць», — упэўнены ён. На думку Міхаіла Мясніковіча, у арганізацый кандытарскай прамысловасці Беларусі нямала добрых напрацовак, неабходна толькі рэалізаваць іх у новых вытворчасцях і сістэме продажаў.

Аляксандр ЯКАБСОН:

«Выраўноўванне беларускіх цэн на харчовыя тавары з расійскімі неабходна»

Выраўноўванне беларускіх цэн на асноўныя віды харчовых тавараў з расійскімі з'яўляецца неабходнасцю. Такі пункт гледжання ўчора на сустрэчы з працоўным калектывам СВК «Маяк Браслаўскі» выказаў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь Аляксандр Якабсон, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

У суседніх Расіі і Украіне цэны на малочную і мясную прадукцыю ў некалькі разоў вышэйшыя за беларускія. На думку Аляксандра Якабсона, гэта стала прычынай таго, што беларускія тавары масава скупляюцца прадпрымальнымі расіянамі і беларусамі і вывозяцца за межы краіны. Межаў, мытных перашкод на шляху гэтага «бізнэсу» няма. «З прадуктамі вывозіцца бюджэт краіны, паколькі вытворчасць малака і мяса ў краіне мае датацыі з бюджэту», — растлумачыў Аляксандр Якабсон.

На яго думку, рост цэн на асноўныя віды прадуктаў харчавання ў Беларусі і давядзенне іх да ўзроўню расійскіх непазбежны. «Людзям трэба разумець, у нас іншага шляху няма: неабходна выраўнаваць цэны да ўзроўню сумежных рэгіёнаў, аднак рыўкоў не павінна быць, паступова, па 3-5 працэнтаў у месяц», — сказаў Аляксандр Якабсон.

Разам з тым кіраўнік кантрольнага ведамства перакананы, што з ростам цэн павінны павышацца зарплаты. «Зарплата павінна расці пры ўмове, што кожны на сваім рабочым месцы добрасумленна выконвае свае абавязкі, павышае прадукцыйнасць, зніжае выдаткі», — падкрэсліў ён.

МОДА НА ПАРАШУТЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Свой 60-ты скачок з парашутам здзейсніла мінская першаразрадніца Таццяна ТУРАВА (на фотаздымку). А мара дзяўчыны — стаць майстрам спорту і выступаць за зборную Беларусі па парашутным спорце. Як, дарэчы, і ў іншых дзяўчат, якія стала трэніруюцца ў небе Баравой пад Мінскам.

ЯК ЗНАЙСЦІ ПРАЦУ, КАЛІ ВАМ ЗА...

Занятасць

Калі мы маладыя, здаецца, што ўвесь свет належыць нам. Але час ляціць хутка, яшчэ хутчэй часы мяняюцца. І каб не сысці з дыстанцыі, трэба не адставаць ад перамен. У першую чаргу гэта тычыцца прафесійнай дзейнасці. Кожны год з'яўляюцца новыя спецыяльнасці, а да старых прад'яўляюцца ўсё новыя патрабаванні. Ну, а калі вы, так атрымалася, страцілі працу... Калі вам ужо за 40... Гэта адчувальная тэма — пошукі добрай працы ў такім узросце, дзе б вы ні жылі: у Брэсце, Маскве або Лондане. Чаму? Давайце разбярэмся.

КОЛЬКІ ВАМ ГАДОЎ?

— Добры дзень! Маё прозвішча Іванова, я высылала вам свае рэзюмэ...

— Так, я бачыла яго... Дарэчы, вы не напісалі, колькі вам гадоў...

— 42.

— Прабачце, але вы нам не падыходзіце.

— Чаму? Гэта не пенсійны ўзрост, усе мае аднагодкі працуюць, чаму ж я не магу? Я маю вялікі вопыт, тым больш прэтэндую не на пазіцыю мадэлі альбо балерыны, а карэктара...

— Ведаеце... — дзяўчына на другім канцы завагалася. — У нас начальнік малады, яму 29 гадоў, і ён хоча, каб супрацоўнікі былі не старэйшымі за яго...

Гэтую размову з інспектарам па кадрах (альбо, хутчэй за ўсё, сакратаркай) адной кампаніі мне з абурэннем пераказала сяброўка (прозвішча якой, натуральна, зменена). Яна ўжо амаль паўгода шукае працу і ўпэўнена, што многіх працадаўцаў адпужвае менавіта яе ўзрост.

Безумоўна, адмова ў працы з-за ўзросту прэтэндэнта — гэта незаконна. Маладая супрацоўніца, якая шчыра прызналася ў прычынах адмовы, мабыць, зусім не мае вопыту, інакш паасцераглася б гаварыць праўду.

Ці азначае гэта, што суіскальнік, якому адмовілі ў працаўладкаванні па ўзроставай прыкмеце, можа звярнуцца ў суд? На жаль, не. Таму што ніводзін працадаўца не скажа афіцыйна, што адмаўляе кандыдату ў прыёме на працу таму, што яму 42 гады. Наймальнік знойдзе цэлы арсенал юрыдычна бездакорных падстаў для адмовы. Напрыклад, можна заявіць, што суіскальнік не задавальняе яго па сваіх дзелавых або прафесійных якасцях (дапусцім, у яго няма навыкаў працы з нейкай праграмай).

Хоць у вакансіях не-не ды і прамільгне: патрабаванні да суіскальніка — не старэйшы за 35 гадоў. Ведайце, гэта — прамое парушэнне закона.

ЧАМУ?

Узроставы цэнз існуе ў большасці прыватных фірмаў. Хоць многія і прызнаюць, што гэта вынік стэрэатыпаў, але тым не менш... Чаму ж не вельмі вітаюць кандыдатаў ва ўзросце?

КРЫХУ СТАТЫСТЫКІ

У Беларусі на 1 жніўня гэтага года налічвалася (зыходзячы з заявак наймальнікаў) 57,7 тыс. свабодных рабочых месцаў. Аднак на рынку працы краіны ёсць структурны дысбаланс попыту і прапановы рабочай сілы: у агульнай колькасці вакансій 80,5% прызначаны для рабочых. Назіраецца і тэрытарыяльны дысбаланс: кожная трэцяя вакансія з агульнарэспубліканскага банка — у Мінску.

Колькасць тых, хто стаіць на ўліку як беспрацоўны, складала на 1 жніўня 30,6 тыс. чалавек. Найбольш шырока сярод іх прадстаўлена ўзроставая група 30-49 гадоў, якая складае 44,1% беспрацоўных. Беспрацоўных ад 50 да 60 гадоў і старэй — 18,8 % (звесткі аб узроставых групах на 1 ліпеня г.г.).

ДЗЕ ЖЫЛЛЁ?

Амаль на працягу трох апошніх месяцаў у Мінску існавала максімальная прапанова здымных кватэр. У той час кліенты мелі магчымасць доўга выбіраць сабе жыллё і патрабавалі ад гаспадароў сур'ёзныя зніжкі. Яшчэ ў ліпені аднапакаёвую кватэру без праблем можна было адшукаць за 150 долараў. Сёння такіх цэннікаў ужо няма, бо попыт зноў, як і заўсёды ў канцы лета, істотна павялічыўся за кошт студэнтаў, у тым ліку і першакурснікаў, якія пачалі шукаць жыллё.

Цяпер самыя «слабенькія» аднапакаёвыя кватэры без мэблі ў Шабанах або ў новабудоўлях побач з кальцавой дарогай каштуюць 180 долараў плюс плата за камунальныя паслугі. Ёсць і таннейшыя кватэры, але ўжо ў Бараўлянах, дзе аднапакаёўкі з мэбляй у новабудоўлях прапануюцца за 150—160 долараў. Сярэдні кошт арэнды стандартных аднапакаёвых кватэр у спальных раёнах павялічыўся да 190—210 долараў. Аднапакаёўкі побач з лініяй метро прапануюцца за 220—230 долараў, а крыху лепшыя кватэры з пральнай машынай і якаснай кухняй цягнуць ужо да 250—270 USD.

Аднапакаёвыя кватэры элітклаcа агульнай плошчай 45—50 квадратных метраў прапануюцца, галоўным чынам, у цэнтры сталіцы. Такія кватэры з еўрарамонтам і бытавой тэхнікай замежнай вытворчасці каштуюць ужо 400—600 долараў.

СЯРЭДНІ КОШТ ДВУХПАКАЁВАК ДАСЯГНУЎ 270 ДОЛАРАЎ

Паводле інфармацыі **агента па аперацыях з жыллёвай нерухомасцю агенцтва нерухомасці «Дзінас» Іны КУЛЬШЫ**, мінімальны цэннік арэнды невялікіх па плошчы двухпакаёвых кватэр без мэблі ў Лошыцы, па вуліцы Казінца, у Шабанах і Чыжоўцы складае цяпер 220 долараў. Сярэдні кошт прапановы двухпакаёвак з мэбляй вагаецца ў межах 270—280 долараў. Тут трэба заўважыць, што больш-менш прывабныя кватэры з якаснай мэбляй студэнтам не прапануюцца катэгарычна. Калі цэннік на такія кватэры крыху вышэйшы, тады разлік ажыццяўляецца ўжо не ў долярах, а ў беларускіх рублях. Пры разліках эквівалент долара вагаецца ў межах ад 6 да 7 тысяч рублёў. Менавіта ў другой дэкадзе жніўня на рынку сталічнай арэнды з'явіўся ўпэўнены попыт на якасныя двухпакаёўкі, «упакаванья» сучаснай пральнай машынай і іншай тэхнікай, а таксама добрай мэбляй. Зараз у агенцтвах нерухомасці існуюць заяўкі на такія кватэры за 350 долараў, аднак яны не заўсёды выконваюцца, бо не хапае прапановы. Сярэдні кошт сапраўды якасных двухпакаёвак цяпер пачынаецца з 400 долараў. Элітныя двухпакаёвыя кватэры каштуюць ужо да тысячы долараў.

Самыя танныя трохпакаёвыя кватэры прапануюцца сёння за 270—280 долараў. У каталозе прапановы існуе некалькі шматпакаёвых кватэр без мэблі ў Шабанах за 250 долараў. Праўда, зусім дрэнныя па якасці кватэры карыстаюцца мінімальным попытам нават у студэнтаў.

Наш эксперт Іна Кульша ўпэўнена, што першая хваля сур'ёзнага попыту з боку студэнтаў пачнецца ўжо ў наступныя выхадныя. У трэцяй дэкадзе жніўня агенцтвы нерухомасці пачнуць масава наведваць бацькі першакурснікаў, а потым у верасні пачнецца сапраўдны студэнцкі ажыятаж.

Самая масавая прапанова трохпакаёвак сярэдняй якасці мае цэнік у межах 350—400 долараў, а кватэры з пральнымі машынамі — 400—450 долараў.

Элітныя трохпакаёвыя кватэры з пачаткі года патаннелі ажно на 700—1000 долараў. Сёння кошт іх стабілізаваўся, а цэннікі на такое жыллё вагаюцца ў межах ад 1 да 1,8 тысячы долараў. Такое самае дарагое жыллё сталіцы здаецца ў арэнду грамадзянам з іншых краін выключна за валюту.

СТАР. 2

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

МЯСА — НА ПРЫЛАЎКІ!

Губернатар Брэстчыны Канстанцін Сумар правёў спецыяльную нараду, прысвечаную забеспячэнню гандлёвай сеткі абласнога цэнтра ахалоджаным мясам. А прычынай для тэрміновага сходу сталі перабоі з мясам, якія назіраюцца ў Брэсце другі тыдзень.

У фірмовыя магазіны мясакамбінатаў людзі займаюць чаргу за некалькі гадзін да адкрыцця. Аўтару гэтых радкоў давялося назіраць, як «штурмавалі» жыхары мікрараёна Кавалёва краму ААТ «Белавежскі». Страх глядзець было, усё гэта вельмі напомніла дэфіцытныя часы пачатку 90-х гадоў. Таму і размовы ў чэргах ды на прыпынках усё часцей можна пачуць на тэму дэфіцыту, які нас чакае. Тады я не адважылася ісці ў гандлёвы пункт. А вось у астатнія дні яе паліцы значна пабяднелі нават у параўнанні з тым, што было яшчэ месяц таму. Ахалоджанага мяса наогул няма. Славутыя «белавежскія» каўбаскі для грылю разбіраюць за хвіліны. У свабодным продажы пасля рабочага дня аказаліся адны свіныя ногі ды дарагія каўбасы.

Вось і губернатар зайшоў у бліжэйшы ад аблвыканкама гастраном ды склікаў нараду. Пытанне перад кіраўніцтвам горада і дырэктарамі профільных прадпрыемстваў было пастаўлена вельмі востра — мяса на прылаўках павінна быць! Калі гэтыя прадпрыемствы з пачатку года прадалі на ўнутраным і знешніх рынках 42 тысячы тон мяса, то і для горада яны мусяць знайсці 40 тон. Нават калі прадаваць тавар для свайго спажыўца з пункту гледжання эканомікі сёння — справа стратная.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ТЭРМІН ДЗЕЯННЯ ЗНІЖАК НА ШЭРАГ ТАВАРАЎ ДЛЯ ПЕНСІЯНЕРАЎ, ІНВАЛІДАЎ І ШМАТДЗЕТНЫХ БАЦЬКОЎ У СТАЛІЧНЫХ КРАМАХ ПРАЦЯГНУТЫ ДА КАНЦА ГОДА

Тэрмін дзеяння зніжак з рознічных цэн, якімі пры набыцці асобных харчовых і нехарчовых тавараў могуць скарыстацца пенсіянеры, інваліды і шматдзетныя бацькі, працягнуты да 31 снежня 2011 года. Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Андрэй Новікаў. Акрамя таго, пашыраны пералік гандлёвых прадпрыемстваў Мінска, якія даюць зніжкі названым катэгорыям грамадзян. Цяпер такіх аб'ектаў 133, у той час як спачатку было 99 (спіс крам і тавараў размешчаны на сайце Мінгарвыканкама minsk.gov.by у раздзеле «Гэта актуальна»). Каб скарыстацца магчымасцю набыць тавары са зніжкай (у асноўным 3-працэнтнай), неабходна прад'явіць пасведчанне інваліда, пенсіянера або шматдзетных бацькі ці маці.

Наталля РАМАНОЎСКАЯ, *«Мінск—Навіны».*

У СТАЛІЧНЫХ ПРАФЕСІЙНЫХ ЛІЦЭЯХ УСТУПНУЮ КАМПАНІЮ ПРАДОЎЖЫЛІ ДА 1 ВЕРАСНЯ

У мінскіх прафесійных ліцэях прадоўжылі ўступную кампанію да 1 верасня з-за недастатковай колькасці пададзеных абітурыентамі дакументаў. Прыём дакументаў планавалася скончыць 20 жніўня. Як паведаміла выканаўца абавязкаў начальніка аддзела прафесійна-тэхнічнай адукацыі камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Людміла Жук, сёлета складаней ідзе набор на спецыяльнасці «Муляр», «Прадзільшчык», «Мантажнік па ліфтах і электрычных пад'ёмніках». Больш ахвотна падаюць дакументы на спецыяльнасці «Слесар па рамонце аўтамабіля», «Вадзіцель катэгорыі С», «Цырульнік», «Аператар сувязі», «Праваднік» і «Прадавец, кантралёр-касір».

Агата ФРЫДРЫХ, *«Мінск—Навіны».*

У КРЫМЕ ПАТАНУЛА ПРАГУЛАЧНАЯ ЛОДКА З 6 БЕЛАРУСАМІ

10 жніўня ў Чорным моры непадалёк ад Феадосіі затанула прагулачная лодка, на якой знаходзіўся 31 пасажыр і 3 члены экіпажа. У ліку пасажыраў было і 6 беларусаў. Усім пацярпелым удалося выратавацца.

Як паведамляе прэс-служба Галоўнага ўпраўлення МНС у Крыме, лодка затанула на адлегласці 750 метраў ад берагавой лініі ў раёне мыса Іллі. Глыбіня мора там — 30 метраў. Сярод пасажыраў было 15 грамадзян Расіі, 6 грамадзян Беларусі і 10 грамадзян Украіны, у тым ліку 2 дзяцей. Адпачывальнікі вярталіся пасля марской экскурсіі і заняткаў дайвінгам у акваторыі бухты «Двухякарная».

Замест дазволеных 12 чалавек на лодцы знаходзілася 34. Паводле слоў пасажыраў, ад бакавой хвалі лодку пачало гайдаць, яна зачарпнула бортам вады і пачала тануць. Прычым хапіла літаральна 1-2 хвілін, каб яна цалкам апынулася пад вадой. У лодцы не было ніякіх выратавальных сродкаў. Людзі, якія апынуліся ў вадзе, імкнуліся адплыць ад лодкі, якая апускалася на дно, як мага далей, і выкарыстоўвалі ў якасці выратавальных сродкаў усё, што было пад рукамі. Адзін мужчына надзьмуў матрац, за які трымаліся не толькі яго жонка і дачка, але і яшчэ шасцёра пацярпелых. Некаторыя пасажыры трымаліся за сумкі, у якіх заставалася паветра, але галоўнае — ніхто не панікаваў. 9 пасажыраў здолелі даплыць да берага самастойна, да астатніх накіраваліся два катары. Медыцынская дапамога, якая чакала пасажыраў на беразе, не спатрэбілася.

Капітан судна, жыхар Феадосіі 1977 г.н., які не меў дазволу на перавозку пасажыраў і ліцэнзіі для заняткаў дайвінгам, затрыманы, заведзена крымінальная справа. Лодку, якая затанула, шукаюць вадалазы.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ТРАНСПАРТНІКІ ПРАПАНУЮЦЬ ПАВЯЛІЧЫЦЬ ПАМЕР ШТРАФУ ЗА БЕЗБІЛЕТНЫ ПРАЕЗД

У КТУП «Мінскгарант» і Міністэрстве транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь лічаць, што памер штрафу за безбілетны праезд павінен быць павялічаны ў некалькі разоў, хаця б да ўзроўню адной базавай велічыні, якая сёння складае 35 000 рублёў. Нагадаем, цяпер сума штрафу 7000 рублёў, што ў 5 разоў менш за кошт месячнага праязнога на адзін від транспарту ў Мінску. Адна з падстаў для павелічэння штрафу — рост колькасці «зайцаў» у сталічным грамадскім транспарце.

Магда КРЭПАК, *«Мінск—Навіны».*

У ГРОДНЕ ПЕРАКУЛІЎСЯ МІКРААЎТОБУС З ПАСАЖЫРАМІ

Гэта здарылася ў сераду вечарам паблізу ад перасячэння вуліц Брыкеля і Таўлая, паведамляе Гродзенская абласная Дзяржаўтаінспекцыя.

Як патлумачыў кіроўца маршруткі, ён страціў пільнасць (няўжо даваў рэшту пры аплаце за паездку?), і ў выніку мікрааўтобус заскочыў на правы бардзюрны камень, перакуліўся і ўпаў на левы бок. Пры гэтым правыя пасажырскія дзверы сарвала з мацаванняў, а вадзіцельскія аказаліся заблакаванымі, і таму людзі выбіраліся з салона праз заднія.

Фота УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Верагодна, «Газэль» не ехала хутка (літаральна побач — святлафор) і, на шчасце, абышлося без цяжкіх наступстваў. Кіроўца траўмаваў руку, а дзве пасажыркі атрымалі ўдары. Усім траім пасля аказання медыцынскай дапамогі шпіталізацыя не спатрэбілася.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

СПЯШАЎСЯ ПАКАЗАЦЦА ДАРОСЛЫМ

17-гадовы пінскі школьнік узяў машыну бацькоў і рашыў пакатаць дзяўчыну. Але не справіўся з кіраваннем, і «Аудзі» перавярнулася на дарозе ля вёскі Плешчыцы. 16-гадовая пасажырка загінула на месцы. Правоў на кіраванне машынай у хлопца па прычыне ўзросту не было.

Яна СВЕТАВА.

МЕРСЕДЭС ЗБІЎ НАСМЕРЦЬ СВАЙГО ЎЛАДАЛЬНІКА

Жудаснае здарэнне адбылося 10 жніўня ў сталіцы на вуліцы Багдановіча. На стаянцы побач з дамам № 153 46-гадовы мужчына выйшаў са свайго Мерседэса. На нявысветленых прычынах машына пакацілася са схілу, збіла свайго ўладальніка і працягнула яго некалькі метраў. Мужчына атрымаў цяжкія цялесныя пашкоджанні і быў дастаўлены ў бальніцу хуткай дапамогі, дзе ўчора раніцай памёр, паведамляе ДАІ Мінгарвыканкама.

Алена КРАВЕЦ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

АЖЫЯТАЖ У ШКОЛЬНЫХ СЕКЦЫЯХ:

з кожным днём магчымасці для выбару змяншаюцца...

Калі вы завіталі на школьны кірмаш і не змаглі знайсці там патрэбны памер адзення для свайго дзіцяці — не адчайвайцеся. Смела пакідайце ў кнізе вывучэння спажывецкага попыту заяўку на канкрэтную мадэль, якая ў дадзены момант адсутнічае ў продажы. Як запэўнілі журналістаў прадстаўнікі канцэрна «Беллегпрам» і Міністэрства гандлю, заяўка пакупніка будзе задаволена на працягу максімум 10 дзён. Гэтая паслуга асабліва актуальная для невялікіх населеных пунктаў, хоць і ў Мінску пакупнікоў не павінны адпраўляць у іншы магазін ці ў секцыю з адзеннем і, адпаведна, цэнамі для дарослых. З улікам акселерацыі сучасных падлеткаў, якія да таго ж усё часцей пакутуюць ад залішняй вагі, касцюмы для хлопчыкаў цяпер шыюцца нават на 52-гі памер, а нага ў школьнікаў можа быць аж 45-га памеру.

— Звычайна пік попыту на тавары школьнага асартыменту прыпадаў у гандлі на другую-трэцюю дэкаду жніўня, але сёлета продажы тавараў для школьнікаў актывізаваліся яшчэ ў ліпені, — расказала **начальнік упраўлення арганізацыі спажывецкага рынку нехарчовых тавараў Міністэрства гандлю Ніна ПАШКО**. — З улікам вынікаў маніторынгу арганізацыямі гандлю былі прынятыя меры па апераджальным атрыманні тавараў школьнага асартыменту ад розных вытворцаў, пастаўшчыкоў і стварэння неабходнага запасу. З канцэрнам «Беллегпрам» былі ўзгодненыя дадатковыя аб'ёмы пастаўкі адзення дзелавога стылю. Прадпрыемствы канцэрна «Беллегпрам» знайшлі магчымасць і пашылі дадаткова 88,2 тысячы адзінак швейных, 68 тысяч трыкатажных вырабаў і 5,3 тысячы пар абутку.

— Асартымент школьнага адзення быў цалкам абноўлены сёлета, — падкрэсліла **начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і маркетынгу канцэрна «Беллегпрам» Людміла ПАРХАМОВІЧ**. — Усяго было распрацавана больш як 350 новых мадэляў адзення дзелавога стылю. Асабліва хацелася б адзначыць новую калекцыю адзення для дзяўчат ад «Калінкі», вырабы якой гарманічна аздоблены тканінамі ў палоску, клетку, трыкатажнымі палотнамі і разнастайнымі арнаментамі. Для дзяўчат з нестандартнымі фігурамі малодшай школьнай групы «Калінка» прапануе мадэлі сарафанаў, камізэлек, спадніц з трыкатажнага палатна з аздабленнем з тэкстыльнага матэрыялу розных каларыстычных рашэнняў. Для хлопчыкаў вытворцамі распрацавана новая калекцыя касцюмаў «Прэміум-клас». Упершыню вытворцы пашылі касцюмы для хлопчыкаў і дзяўчынак з джынсавых і вельветавых тканін з аздабленнем з натуральнай скуры. Дэталі з натуральнай скуры размешчаны ў тых у месцах, якія ў найбольшай ступені падвяргаюцца выціранню. Таксама школьнікам на асенне-зімовы сезон прапануюцца вырабы з касцюмнай уцепленай джынсавай тканіны. Для малодшых школьнікаў пашытыя пінжакі і жакеты з нанесенай на падкладцы табліцай множання (своеасаблівай шпаргалкай).

СТАР. 2

Даведка «Звязды»:

Да канца жніўня ў краіне будуць праведзены 783 школьныя кірмашы: 150 — у Брэсцкай вобласці, 100 — у Віцебскай, 220 — у Гомельскай, 75 — у Гродзенскай, 100 — у Магілёўскай, 110 — у Мінскай вобласці і 22 — у Мінску. Для паскарэння абслугоўвання пакупнікоў у гандлёвых арганізацыях адкрыта каля 300 дадатковых гандлёвых месцаў. Усяго продаж тавараў школьнага асартыменту ажыццяўляюць 7,5 тысячы гандлёвых аб'ектаў. У вытворчасці школьнай калекцыі адзення і абутку задзейнічана 30 айчынных прадпрыемстваў, у тым ліку 21 прадпрыемства канцэрна «Беллегпрам».

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.08.2011 г. (для б/н разлікаў)			
▲ 1 долар ЗША	5 020,00	1 чэшская крона	295,60
▼ 1 еўра	7 151,99	1 польскі злоты	1 718,18
1 латвійскі лат	10 081,33	▼ 1 расійскі рубель	170,65
1 літоўскі літ	2 072,03	1 украінская грыўня	627,97

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
USD	29,4170
10 UAH	36,8380
10000 BYR	58,7048
EUR	41,9075

Жыллё

СТАЛІЧНАЯ АРЭНДА ПАЧАЛА ДАРАЖЭЦЬ І Ў ВАЛЮЦЕ

Сяргей КУРКАЧ.

У той час, калі на мінскім другасным рынку жыллёвай нерухомасці назіраецца ўпэўненае патанненне (маецца на ўвазе доларавы эквівалент коштаў), на рынку арэнды кватэр «запрацавалі» ўжо іншыя тэндэнцыі, калі актывізацыя студэнтаў спрыяе чарговаму сезонному падаражанню арэнды.

ПОПЫТ АБГАНЯЕ ПРАПАНОВУ

Амаль на працягу трох апошніх месяцаў у Мінску існавала максімальная прапанова здымных кватэр. У той час кліенты мелі магчымасць доўга выбіраць сабе жыллё і патрабавалі ад гаспадароў сур'ёзныя зніжкі. Яшчэ ў ліпені аднапакаёвую кватэру без праблем можна было адшукаць за 150 долараў. Сёння такіх цэннікаў ужо няма, бо попыт зноў, як і заўсёды ў канцы лета, істотна павялічыўся за кошт студэнтаў, у тым ліку і першакурснікаў, якія пачалі шукаць жыллё.

Цяпер самыя «слабенькія» аднапакаёвыя кватэры без мэблі ў Шабанах або ў новабудоўлях побач з кальцавой дарогай каштуюць 180 долараў плюс плата за камунальныя паслугі. Ёсць і таннейшыя кватэры, але ўжо ў Бараўлянах, дзе аднапакаёўкі з мэбляй у новабудоўлях прапануюцца за 150—160 долараў. Сярэдні кошт арэнды стандартных аднапакаёвых кватэр у спальных раёнах павялічыўся да 190—210 долараў. Аднапакаёўкі побач з лініяй метро прапануюцца за 220—230 долараў, а крыху лепшыя кватэры з пральнай машынай і якаснай кухняй цягнуць ужо да 250—270 USD.

Аднапакаёвыя кватэры элітклаcа агульнай плошчай 45—50 квадратных метраў прапануюцца, галоўным чынам, у цэнтры сталіцы. Такія кватэры з еўрарамонтам і бытавой тэхнікай замежнай вытворчасці каштуюць ужо 400—600 долараў.

СЯРЭДНІ КОШТ ДВУХПАКАЁВАК ДАСЯГНУЎ 270 ДОЛАРАЎ

Паводле інфармацыі **агента па аперацыях з жыллёвай нерухомасцю агенцтва нерухомасці «Дзінас» Іны КУЛЬШЫ**, мінімальны цэннік арэнды невялікіх па плошчы двухпакаёвых кватэр без мэблі ў Лошыцы, па вуліцы Казінца, у Шабанах і Чыжоўцы складае цяпер 220 долараў. Сярэдні кошт прапановы двухпакаёвак з мэбляй вагаецца ў межах 270—280 долараў. Тут трэба заўважыць, што больш-менш прывабныя кватэры з якаснай мэбляй студэнтам не прапануюцца катэгарычна. Калі цэннік на такія кватэры крыху вышэйшы, тады разлік ажыццяўляецца ўжо не ў долярах, а ў беларускіх рублях. Пры разліках эквівалент долара вагаецца ў межах ад 6 да 7 тысяч рублёў. Менавіта ў другой дэкадзе жніўня на рынку сталічнай арэнды з'явіўся ўпэўнены попыт на якасныя двухпакаёўкі, «упакаванья» сучаснай пральнай машынай і іншай тэхнікай, а таксама добрай мэбляй. Зараз у агенцтвах нерухомасці існуюць заяўкі на такія кватэры за 350 долараў, аднак яны не заўсёды выконваюцца, бо не хапае прапановы. Сярэдні кошт сапраўды якасных двухпакаёвак цяпер пачынаецца з 400 долараў. Элітныя двухпакаёвыя кватэры каштуюць ужо да тысячы долараў.

Самыя танныя трохпакаёвыя кватэры прапануюцца сёння за 270—280 долараў. У каталозе прапановы існуе некалькі шматпакаёвых кватэр без мэблі ў Шабанах за 250 долараў. Праўда, зусім дрэнныя па якасці кватэры карыстаюцца мінімальным попытам нават у студэнтаў.

Наш эксперт Іна Кульша ўпэўнена, што першая хваля сур'ёзнага попыту з боку студэнтаў пачнецца ўжо ў наступныя выхадныя. У трэцяй дэкадзе жніўня агенцтвы нерухомасці пачнуць масава наведваць бацькі першакурснікаў, а потым у верасні пачнецца сапраўдны студэнцкі ажыятаж.

Самая масавая прапанова трохпакаёвак сярэдняй якасці мае цэнік у межах 350—400 долараў, а кватэры з пральнымі машынамі — 400—450 долараў.

Элітныя трохпакаёвыя кватэры з пачаткі года патаннелі ажно на 700—1000 долараў. Сёння кошт іх стабілізаваўся, а цэннікі на такое жыллё вагаюцца ў межах ад 1 да 1,8 тысячы долараў. Такое самае дарагое жыллё сталіцы здаецца ў арэнду грамадзянам з іншых краін выключна за валюту.

СТАР. 2

У БЕЛАРУСІ ЎДАСКАНАЛЬВАЕЦЦА ПРЫМЯНЕННЕ СПРОШЧАНАЙ СІСТЭМЫ ПАДАТКААБКЛАДАННЯ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 9 жніўня падпісаў указ № 349 «Аб некаторых пытаннях прымянення спрошчанай сістэмы падаткаабкладання», — паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Дакумент накіраваны на рэалізацыю палажэнняў Дырэктывы Прэзідэнта ад 31 снежня 2010 года № 4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь» і, у прыватнасці, на ўдасканаленне прымянення спрошчанай сістэмы падаткаабкладання.

У адпаведнасці з указам прадастаўлена права: арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам на прымяненне ў 2011 годзе спрошчанай сістэмы пры памеры валавой выручкі не больш як Br12 млрд нарастаючым вынікам на працягу каляндарнага года (прымяненне спрошчанай сістэмы без выплаты ПДВ, а таксама з выкарыстаннем у якасці падатковай базы валавога даходу магчыма пры памеры валавой выручкі (даходу) Br3,4 млрд); арганізацыям з колькасцю работнікаў не больш як 15 чалавек, а таксама індывідуальным прадпрымальнікам не ажыццяўляць вядзенне бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці, а весці ўлік у кнізе ўліку даходаў і расходаў арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прымяняюць спрошчаную сістэму; плацельшчыкам, якія да ўступлення ўказа ў сілу перайшлі са спрошчанай сістэмы на агульную сістэму або на спрошчаную сістэму з выплатай ПДВ, аднавіць прымяненне спрошчанай сістэмы.

Указам замацавана норма аб адсутнасці неабходнасці паўторнай падачы ў падатковы орган заявы аб аднаўленні прымянення спрошчанай сістэмы плацельшчыкамі, якія спынілі яе прымяненне, а таксама рэгулюецца парадак пераразліку падаткаў, зборах (пошлін) іншых абавязковых плацяжоў у выпадках пераходу са спрошчанай сістэмы на агульную сістэму або назад.

Дакументам таксама вызначаны гранічны памер валавой выручкі для пераходу на прымяненне спрошчанай сістэмы з 1 студзеня 2012 года. З улікам устаноўленага дакументам павышэння гранічнага памеру валавой выручкі да Br12 млрд вызначаны ў такой жа прапорцыі памер валавой выручкі за першыя 9 месяцаў 2011 года, пры выкананні якога арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі могуць з 1 кастрычніка па 30 лістапада 2011 года прадставіць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік заяву аб пераходзе на спрошчаную сістэму з 1 студзеня 2012 года, складзе Br9 млрд.

Згодна з прынцыпамі гуманізму

Кіруючыся прынцыпамі гуманізму і справядлівасці, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў шэраг прававых актаў аб вызваленні ад крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі вызваліў 25 арганізацый розных форм уласнасці і індывідуальных прадпрымальнікаў ад адміністрацыйных спагнанняў. Сярод іх — ААТ «ІНТЭГРАЛ», ААТ «Зеніт-БелОМА», ААТ «Аршанскі малочны камбінат» і іншыя прадпрыемствы, якія маюць важнае значэнне для развіцця краіны і асобных рэгіёнаў. Прынятае рашэнне палепшыць эканамічны стан гэтых арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў і будзе садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці іх работы.

Кіраўніком дзяржавы прынята рашэнне аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці 28 кіраўнікоў суб'ектаў гаспадарання, прадпрымальнікаў і грамадзян, якія добраахвотна і ў поўным аб'ёме кампенсавалі прычыненны злачынствамі ўрон дзяржаве і шкоду ад іншых наступстваў сваіх злачынных дзеянняў.

Прэзідэнт Беларусі таксама памілаваў, вызваліўшы ад адбывання пакарання, 9 чалавек з ліку актыўных удзельнікаў масавых беспарадкаў на плошчы Незалежнасці 19 снежня 2010 года. Такое рашэнне прынята на падставе просьбаў названых асоб, з улікам таго, што яны ўсвядомілі проціпраўны характар сваіх дзеянняў, прызналі віну і шчыра раскаяліся.

СТАЛІЧНАЯ АРЭНДА ПАЧАЛА ДАРАЖЭЦЬ І Ў ВАЛЮЦЕ

Студэнцкі ажыятаж пачнецца праз тыдзень

Наш эксперт Іна Кульша ўпэўнена, што першая хваля сур'ёзнага попыту з боку студэнтаў пачнецца ўжо ў наступныя выхадныя. У трэцяй дэкадзе жніўня агенцтвы нерухомасці пачнуць масава наведваць бацькі першакурснікаў, а потым у верасні пачнецца сапраўдны студэнцкі ажыятаж. Што будзе тады з цэнамі на арэнду?

А нічога, лічыць Іна Кульша. Цэны на якасныя кватэры ўжо павялічыліся, акрамя таго, долары сталі вельмі дарагімі, таму далёка не кожная кішэня пацягне такі цэннік. Магчыма, на піку ажыятажнага попыту кошт арэнды ў верасні можа крыху павялічыцца, аднак падобная сітуацыя можа працягнуцца, лічыць эксперт, не больш за адзін-два месяцы.

У сённяшніх складаных часы ўсё большая частка студэнтаў шукае ўжо не асобныя кватэры, а пакойчыкі ці нават ложка-месца ў жылым памяшканні разам з гаспадаром. Кошт асобнага пакойчыка складае цяпер 90—100 долараў, або 50—60 долараў з чалавека, калі засяляюцца ўдваіх.

Пошук асобнага пакойчыка, дзе паслуга агенцтваў нерухомасці прадугледжвае плату па факце засялення, каштуе клієнтам 175 тысяч рублёў. За паслугу з фактычным засяленнем у кватэру коштам да 300 долараў кватарантам неабходна заплаціць агенцтву ўжо 350 тысяч. Паслуга агенцтва па кватэрах з цэннікам арэнды ад 600 да 500 долараў каштуе ад 455 да 525 тысяч, па кватэрах у дыяпазоне коштаў 510—700 долараў — 630—805 тысяч, а па кватэрах элітклаcа з арэндай — звыш 710 долараў агенцтву неабходна будзе заплаціць ад 980 да 1 млн 505 тысяч рублёў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У далёкай перспектыве арэнда працягне даражэць

Іна Кульша лічыць, што ў бліжэйшыя 6 месяцаў кошт арэнды істотна не зменіцца (калі не ўлічваць сезонныя ваганні). Разам з тым, новыя крытэрыі патрэбнасці ў жыллі ў Мінску, якія зніжаны да 10 квадратных метраў на чалавека і павелічэнне да 10 гадоў тэрміну, што абмяжоўвае пастаноўку на жыллёвы ўлік грамадзян, якія прыбылі ў сталіцу з іншых населеных пунктаў, паўплывае на далейшую актывізацыю патэнцыйных кватарантаў на рынку арэнды. Іншагароднім будавацца ў сталіцы стане складаней. Не зможа будавацца з ільготнымі крэдытамі і «залатая» моладзь, якая жыве з бацькамі ва ўласных кватэрах і мае нядрэнныя заробкі. Усе гэтыя клієнты будуць вымушаны набываць кватэры на другасным рынку, будаваць жыллё па камерцыйных цэнніках або здымаць жылыя памяшканні па рынкавым кошце. Пасля таго, як попыт на здымнае жыллё істотна павялічыцца, арэнда на яго пачне даражэць. Гэта абавязкова будзе, але не заўтра і нават не сёлета, лічыць Іна Кульша.

ТАРЫФЫ НА ПРАЕЗД У МІЖГАРОДНІХ АЎТОБУСАХ ПАВЯЛІЧЫЛІСЯ

З 12 жніўня дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» на рэгулярныя рэйсы па міжгародніх маршрутах, якія абслугоўваюцца аўтобусамі прадпрыемства, устанаўлівае новыя тарыфы.

Так, на звычайных маршрутах цяпер за адзін кіламетр праезду давядзецца плаціць: у аўтобусах агульнага тыпу — 180 рублёў (дагэтуль было 171,4 рубля), у машынах з мяккімі адкіднымі сядзеннямі — 186 рублёў (было 176,4 рубля). На хуткасных маршрутах тарыф складзе: у аўтобусах агульнага тыпу — 234 рублі за адзін кіламетр праезду (замест 203,8 рубля), у аўтобусах з мяккімі адкіднымі крэсламі — 242 рублі (дагэтуль было 210 рублёў). На дадатковых маршрутах змяненні такія. Калі раней адзін кіламетр праезду ў аўтобусе агульнага тыпу каштаваў 212,2 рубля, дык цяпер — 244 рублі за той жа кіламетр. Тарыф на праезд у аўтобусах з мяккімі адкіднымі сядзеннямі павялічыўся з 217,4 рубля за кіламетр праезду да 250 рублёў.

Адначасова ўстанаўліваюцца і тарыфы ў аўтобусах прадпрыемства па наступных маршрутах. Мінск — Пінск праз Клецк (12.00 і 15.40) — 190 рублёў за адзін кіламетр праезду (замест ранейшых 180 рублёў); Мінск — Пінск праз Клецк (8.10) — 180 рублёў за кіламетр (было 171,4 рубля); Мінск — Давыд-Гарадок праз Слуцк (7.20) — 180 рублёў за кіламетр (171,4 рубля); Мінск — Барысаў (усе) — 180 рублёў за кіламетр праезду (замест ранейшых 170,1 рубля); Мінск — Магілёў (6.20, 8.05, 11.00, 11.50, 13.10 — штодзень, у 9.10 па будных днях і ў 8.00 — па суботах і нядзелях); Мінск — Чавусы (9.10) — 198 рублёў за кіламетр (замест ранейшых 189 рублёў). Дзецям ва ўзросце ад 5 да 10 гадоў у аўтобусах дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс» даецца зніжка ў 50 працэнтаў ад велічыні тарыфу, што выкарыстоўваецца на маршруце.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СЯРЭДНЯМЕСЯЧНАЯ ПРАЦОЎНАЯ ПЕНСІЯ Ў БЕЛАРУСІ Ў СТУДЗЕНІ—ЖНІЎНІ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ НА 32 ПРАЦЭНТЫ

У Беларусі сярэднямесячны памер пенсіі ўсіх відаў у студзені—жніўні гэтага года на 32,1 працэнта большы ў параўнанні з аналагічным перыядам 2010 года. Памер сярэднямесячнай працоўнай пенсіі перавысіў узровень адпаведнага перыяду мінулага года на 32 працэнты. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў галоўным упраўленні пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Памер сярэдняй працоўнай пенсіі ў жніўні складае Br774,7 тыс., сярэдняя пенсія ўсіх відаў складае Br767,1 тыс.

Паводле статыстычнай справаздачнасці, сярэдняя пенсія па ўзросце ў жніўні — Br795,2 тыс., мінімальная па ўзросце (з улікам даплаты да яе) — Br549,4 тыс. Памер сярэдняй пенсіі па інваліднасці — Br708,4 тыс., па прычыне страты карміцеля — Br506 тыс., за выслугу гадоў — Br1 млн 35,7 тыс., за асаблівыя заслугі перад рэспублікай — Br1 млн 171 тыс. Паводле слоў спецыялістаў, памеры пенсіі па інваліднасці і пенсіі па прычыне страты карміцеля прыводзяцца без уліку адпаведных пенсій у выніку працоўнага калецтва і прафесійнага захворвання.

Сярэднямесячны памер сацыяльнай пенсіі складае ў студзені—жніўні Br284,5 тыс. (у тым ліку ў жніўні — Br411,6 тыс.), што на 45,4 працэнта больш у параўнанні са студзенем—жніўнем мінулага года.

Запрашальнік

АШМЯНЫ ЗАПРАШАЮЦЬ АМАТАРАЎ МОТАКРОСУ

13 і 14 жніўня ў г. Ашмяны пройдзе адзін з этапаў Кубка MASES (матацыклетная асацыяцыя краін Цэнтральнай Еўропы). Сваё майстэрства на ашмянскай трасе прадэманструюць гоншчыкі з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, краін Прыбалтыкі, Малдовы, Славакіі і іншых краін.

Спаборніцтвы адбудуцца ў класах матацыклаў з аб'ёмам 85см³, 125 см³, 500 см³ і самым масавым класе — «хобі». Чакаюць і гасцей з Еўрапейскага матацыклетнага саюза.

Акрамя гэтага, спецыяльная камісія правядзе інспекцыю трасы на прадмет правядзення ў 2012 годзе этапу чэмпіянату Еўропы.

13 жніўня ў 14.30 пачнуцца афіцыйныя трэніроўкі ва ўсіх класах, і пасля 16.30 пройдзе першы заезд у класе «хобі». 14 жніўня ў 12.00 — другі заезд у «хобі» і пасля па два заезды ў астатніх класах.

Ірына ТАМКОВІЧ.

Факт

У склепе стала пуста

У в. Мілавіды, што ў Баранавіцкім раёне, нехта збіў замок у склепе адной гаспадыні і вынес адтуль 74 слоікі з марынаванай гароднінай.

Гаспадыня ацаніла ўкрадзенае ў 1,5 млн рублёў. Злодзея шукаюць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Рабочы скраў чарніцы

Беспрацоўны з Полацка паскардзіўся ў раённы аддзел унутраных спраў на тое, што ў яго на беразе ракі Обаль скралі вядро чарніц. Страту ацаніў у 125 тысяч рублёў. Аказалася, што чужыя ягады прыхапіў 22-гадовы рабочы, раней ужо судзімы за крадзеж. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АЖЫЯТАЖ У ШКОЛЬНЫХ СЕКЦЫЯХ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Людміла Пархамовіч запэўніла, што ніякіх праблем у вучняў, якія прыйдуць у школу з касцюме з джынсавай тканіны, які набываўся на школьным кірмашы, узнікаць не павінна. Усе гэтыя мадэлі былі адобраныя Каардынацыйнай радай па пытаннях увядзення ў школе дзелавога стылю адзення, а, значыць, дапушчаныя ў школы.

А як быць, калі верх касцюма падыходзіць дзіцяці, а ніз — не? «Ніякіх праблем, — сцвярджае Ніна Пашко. — Вытворцы і гандаль вырашылі праблему разукамплектавання касцюмаў. Цяпер цана пазначаецца не на ўвесь выраб цалкам, а кожны элемент ацэньваецца асобна...»

Па словах Ніны Пашко, многія гандлёвыя арганізацыі праводзяць акцыі сацыяльнай накіраванасці, скіраваныя на зніжэнне ці прымяненне мінімальных гандлёвых надбавак на школьны асартымент, продаж гэтых тавараў у растэрміноўку і крэдыт, прадастаўляюць зніжкі шматдзетным сем'ям. Для прыкладу, у Брэсцкай вобласці з 15 ліпеня да 10 верасня 10 буйных гандлёвых арганізацый прапаноўваюць зніжкі ад 3 да 10 працэнтаў ад рознічнай цаны на тавары для школьнікаў са шматдзетных сем'яў. Магазін «Бураціна» ў Пінску пры набыцці тавараў на суму больш як 150 тысяч рублёў прадастаўляе пакупнікам растэрміноўку на 3 месяцы з першапачатковым узносам 50 працэнтаў. ААТ «Віцебскі ўнівермаг» прапаноўвае крэдыт на 6 месяцаў пад 14 працэнтаў пры набыцці тавараў больш як на 350 тысяч рублёў. Сталічны «ГУМ» пры набыцці тавараў школьнага асартыменту на суму 500 тысяч рублёў і больш дае пакупнікам беспрацэнтны крэдыт тэрмінам да 6 месяцаў з першапачатковым узносам 10 працэнтаў ад кошту пакупкі. Сталічны універмаг «Беларусь» прапаноўвае шматдзетным сем'ям 10-працэнтную зніжку на ўсе тавары для школьнікаў. Аналагічныя акцыі праводзяцца і іншымі арганізацыямі гандлю.

Да таго ж, у адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 6 жніўня 2011 года № 1052 «Аб прадастаўленні грамадзянам ільготных крэдытаў на спажывецкія патрэбы для набыцця тавараў для дзяцей», насельніцтва мае магчымасць набываць тавары да школьнага сезона з выкарыстаннем ільготных крэдытаў. Тэрмін дзеяння пастановы вызначаны да 1 кастрычніка 2011 года. Крэдыты будуць выдавацца тэрмінам на тры гады з выплатай дзесяці працэнтаў гадавых за карыстанне крэдытам. Бацькам школьнікаў карысна будзе таксама ведаць, што з 23 па 31 жніўня на плошчах выставачнага цэнтра «Белэкспа» ў Мінску запланавана правядзенне міжнароднай спецыялізаванай выставы-кірмашу «Нашым дзецям-2011», на якой будзе арганізаваны продаж усіх школьных тавараў. А 27 жніўня ў Мінску на пляцоўцы побач з Палацам спорту пройдзе кірмаш «Прывітанне, школа!» з удзелам і гандлёвых арганізацый, і непасрэдна вытворцаў. У Віцебску, Оршы, Полацку, Наваполацку аналагічныя кірмашы пройдуць 20 і 27 жніўня. У Пінску — 20 жніўня. У Гродне з 25 жніўня па 5 верасня будзе праходзіць кірмаш на плошчы Савецкай з удзелам 40 суб'ектаў гандлю, у тым ліку 10 індывідуальных прадпрымальнікаў. Ва ўсіх райцэнтрах Гомельскай вобласці кірмашы будуць ладзіцца 20, 21, 27 і 28 жніўня.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Антикризисный управляющий ПТЧУП «Дом молодежи» осуществляет реализацию открыток и иного имущества предприятия. Контактный телефон 8 (029) 317 23 32.
УНП 190409351

Утерянный представительством Белгосстраха по Заводскому району бланк страхового полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВС № 3762669 считать недействительным. *УНП 101883943*



ЯК ЗНАЙСЦІ ПРАЦУ, КАЛІ ВАМ ЗА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Такія перавагі сталага ўзросту як мудрасць, разважлівасць, дасягненні ў прафесійным плане сёння недаацэньваюцца. Раней старэйшыя перадавалі малодшым свае веды, сёння веды ёсць у інтэрнэце. Моладзь, сутыкаючыся з сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі, пачувае сябе як рыба ў вадзе, і менавіта старэйшыя вымушаны цяпер вучыцца карыстацца імі ў маладых. Зусім нядаўні выпадак, які адбыўся на маіх вачах: пажылы акадэмік, член-карэспандэнт акадэміі навук тэлефануе 14-гадоваму ўнуку, каб запытацца у яго, як распакаваць электронную кнігу з архіва...

Магчыма, камусьці здасца, што даваць парады збоку вельмі проста, што пакуль ўшчыльную не сутыкнешся з гэтай праблемай, не зразумееш яе сутнасці. Ніхто не спрачаецца, што з узростам звужаецца магчымасць выбару новай працы. Аднак выбар усё ж існуе. Прыйдзецца выдаткаваць больш часу на пошукі, можа быць, гагадзіцца на не самыя лепшыя ўмовы, але шанц знайсці прыстойнае месца ёсць заўсёды. Зразумела, калі вы сапраўды добры спецыяліст і сапраўды хочаце працаваць.

Так што вызначцеся са сваімі мэтамі, расстаўце прыярытэты, а ў якасці аргументаў для пераканання працадаўцы выкарыстоўвайце вопыт, пачуццё ўласнай годнасці і моцнае жаданне атрымаць месца.

ВАШ ВОПЫТ

Самы важны крытэрый пры прыёме на працу — гэта прафесіяналізм, а ён прыходзіць з вопытам. Таму на шэраг пасад (напрыклад, бухгалтар, лекар ці юрыст) працадаўцы аддаюць перавагу прымаць людзей сталага ўзросту. Вам трэба навучыцца пазначаць вашы моцныя бакі ў рэзюмэ, а таксама падкрэсліваць іх на гутарцы. Вучыцеся «прадаваць» сябе, без гэтага ўмення сёння не пражыць. Калі трэба — не адварочвайцеся ад спецыяльных трэнінгаў.

ГАТОЎНАСЦЬ ВУЧЫЦЦА

Вы скончылі навучальную ўстанову пару дзесяцігоддзяў назад або, можа быць, наогул працуеце не па атрыманай спецыяльнасці? Тады графа «адукацыя» ў вашым рэзюмэ павінна быць больш шырокая, чым у іншых суіскальнікаў. Запішыце туды ўсе курсы і семінары, якія вы праслухалі. Ваш настрой «вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца» дадасць вам балаў у вачах працадаўцы. Згадваючы пра нядаўна набытыя ўменні, вы дэманструеце яму, што гатовыя развівацца і ісці наперад. Без гэтага зараз ніяк — час такі.

МАЛАДЖАВЫ ЗНЕШНІ ВЫГЛЯД

Працадаўцаў часта адпуджвае не сам ўзрост суіскальніка, а імідж «старой клячы». Таму для вас вельмі важна выглядаць падцягнута і маладжава. Падтрымлівайце сябе ў добрай фізічнай форме, а перад гутаркай не пашкадуйце грошай на стыльную прычоску і модны ўбор. Гэтыя выдаткі акупяцца, калі вы атрымаеце месца.

ЭНЕРГІЧНАСЦЬ І МАБІЛЬНАСЦЬ

Вы павінны выглядаць энергічным чалавекам. Вы не збіраецеся ціха «адседзець» гады, што засталіся да пенсіі, вы поўныя планаў і памкненняў. Як гэта даказаць? На гутарцы больш кажыце пра будучыню: «я маю намер», «я збіраюся», «мне б хацелася працягнуць».

НЯМА НІЧОГА ГАНЕБНАГА Ў ЗАНІЖЭННІ ДАМАГАННЯЎ

Згаджайцеся на любую хоць трохі прымальную працу — гэта не навечна, да таго ж, унутры арганізацыі магчымы кадравыя перасоўванні. Растлумачыць наступнаму працадаўцу прычыну такога рашэння значна прасцей, чым тлумачыць працяглы прастой — вас сапраўды могуць прыняць за гультая.

Святлана БУСЬКО.

КАРЫСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

ХТО МАЕ ПРАВА НА БЯСПЛАТНУЮ ПРАФЕСІЙНУЮ ПЕРАПАДРЫХТОЎКУ І ПА ЯКІХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ ЯНА ПРАВОДЗІЦЦА?

Адказвае намеснік загадчыка аддзела прафнавучання і прафарыентацыі камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Вікторыя ФЕДАРОВІЧ:

— У адпаведнасці з Законам аб занятасці, на гэта мае права зарэгістраваны беспрацоўны. Служба занятасці можа направіць яго на бясплатную прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі — з улікам грамадскіх патрэбнасцяў і ў адпаведнасці з наяўнымі схільнасцямі, здольнасцямі і навыкамі.

Прафесійнае навучанне беспрацоўных праводзіцца на дзённай форме навучання ва ўстановах адукацыі. Яго працягласць — ад 2 да 11 месяцаў. У перыяд навучання па накіраванню органаў службы занятасці насельніцтва грамадзянам выплачваецца стыпендыя ў памеры ад 1 да 3 базавых велічынь, аказваецца матэрыяльная дапамога, кампенсуюцца выдаткі на праезд і пражыванне пры праходжанні навучання не па месцы рэгістрацыі. Сам перыяд навучання залічваецца ў агульны працоўны стаж.

У Мінску, напрыклад, можна прайсці прафесійнае навучанне больш чым па 40 прафесіях (спецыяльнасцях), такім як кладаўшчык, адміністратар, інжынер-праграміст, вадзіцель, аператар ПЭВМ з рознымі модулямі, цырульнік, майстар па манікюры, па будаўнічых спецыяльнасцях, бухгалтарскім уліку і кантролі ў прамысловасці і інш.

НА ЯКУЮ ФІНАНСАВУЮ ДАПАМОГУ АД СЛУЖБЫ ЗАНЯТАСЦІ МОЖА РАЗЛІЧВАЦЬ БЕСПРАЦОЎНЫ, ЯКІ ЗБІРАЕЦЦА ЗАРЭГІСТРАВАЦЦА ЯК УЛАСНЫ ПРАДПРЫМАЛЬНІК?

Адказвае намеснік начальніка аддзела рынка працы і арганізацыі новых працоўных месцаў камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Галіна КУЛАКОЎСКАЯ:

Калі зарэгістраваны ў службе занятасці беспрацоўны пажадае адкрыць уласную справу, яго могуць накіраваць на бясплатныя 2-тыднёвыя курсы па асновах прадпрымальніцкай дзейнасці. Падчас навучання будзе выплачвацца стыпендыя. Далей трэба будзе абараніць свой бізнэс-план, які можна напісаць самому альбо скарыстаць тыповы.

Пасля гэтага суіскальнік можа паўторна звярнуцца ў службу занятасці, каб атрымаць фінансавую падтрымку. Калі яго бізнэс-ідэю палічаць паспяховай, ён можа разлічваць на фінансавую дапамогу ў памеры 11 бюджэтаў пражыткоўага мінімуму. Але пры гэтым чалавек бярэ на сябе абавязацельства даць справаздачу на працягу першых трох месяцаў аб тым, што сродкі, якія ён атрымаў, выкарыстаныя па мэтавым прызначэнні. Жыхарам сельскай мясцовасці выдаюць фінансавую дапамогу ў памеры 15 бюджэтаў пражыткоўага мінімуму.

Яшчэ адзін нюанс: у кожным рэгіёне мясцовыя ўлады вызначаюць найбольш значныя для рэгіёна віды дзейнасці. І калі ваш бізнэс будзе адносіцца да аднаго з іх, шанц атрымаць субсідыю павялічваецца.

ДАХОДЫ ЁСЦЬ, АЛЕ ДЗЕ ПАДАТКІ?

Сітуацыя

Незаконная акцыя пратэсту «чаўнакоў» у пункце пропуску «Брузгі» пасля ўводу новага парадку вывазу аўтамабільнага паліва і іншай прадукцыі за межы Беларусі, пра што паведамляла «Звязда», атрымала працяг.

Згодна з інфармацыяй пракуратуры Гродзенскай вобласці, завадатарам пікета, у выніку якога ў пункце пропуску быў на некалькі гадзін спынены рух транспартных сродкаў, прад'яўлены іск у памеры каля дзесяці мільёнаў рублёў — на пакрыццё расходаў міліцыі, памежнай групы і рэгіянальнай мытні па прычыне несанкцыянаванай акцыі. Гэтая сума, пэўна, магла і павялічыцца, калі б санкцыі да незадаволеных новымі «правіламі гульні» прад'явілі яшчэ і «дальнабойшчыкі», а таксама тыя, хто ехаў праз беларуска-польскую мяжу па асабістых справах з зусім не камерцыйнай мэтай, але быў вымушаны амаль увесь вечар прастаяць у чарзе.

